№ 8. Панядзелак, 31 кастрычніка (18 акцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

За мінуўшы тыдзень было некалькі дужа цікаўных навін.

Найперш трэба адзначыць падзеі ў **Угоршчыне** (Вэнгрыі).

Як вядома, посьле няўдачнага для Аўстра-Угорскай манархіі скамчэньня вайны там зрабілася рэвалюцыя. Кароль мусіў уцякаць. Шмат-нацыянальная манархія адразу разьляцелася на некалькі кавалкаў.

Абскубаныя суседзямі Аўстрыя і Угоршчына засталіся кожная па сабе, асобнымі рэспублікамі; паўсталі з быўшых частак аўстра-угорскіх земляў новыя гаспадарствы, як рэспубліка Чэха-Славакія, або разам з ранейшай Сэрбіяй і Чарнагорыяй—новае каралеўства Юга-Славія, частка зямлі ўвашла ў склад Польшчы, Румыніі, Італіі.

Угоршчына неўзабаве зрабілася савецкай рэспублікай. Але угорскія камуністы, з Бэла-Кунам на чале, ня ўдзержыліся. У іх, з дапамогаю Антанты, адабралі ўладу соцыялісты, якія аднак, зараз-жа былі скінуты, і ўлада трапіла ў рукі правых і глаўным чынам вайсковых.

Быўшы імпэратар Карла некалькі разоў пасыкаўся прасьлізнуць з заграніцы ў Угоршчыну, каб абвесьціць адбудову манархіі. Яму ўсё не удавалася, затое што суседнія маладыя рэспублікі баяцца манархічнай Угоршчыны і ўсімі сіламі перашкаджаюць гэтаму імпэратару, націскаючы на Антанту, ад якой запраўды ўсё толькі й залежыць.

Нядаўна Угоршчына, як ужо пісалася, завязлась з Аўстрыяй, каб адабраць у яе некаторыя сумежныя землі. Гэта ёй, дзякуючы пагрозам Антанты, не ўдалося, і дзеля таго сярод пеўнай часьці угорцаў стварыўся патрыятычны і падвышаны настрой. Быўшы імпэратар Карла улучыў зручную часіну і на гэтым тыдні прыляцеў з Швайцарыі ў Угоршчыну на аэрапляне. Памагала яму і давала кошты, разумеецца, сусьветная манархічная арганізацыя, глаўным чынам, расейскія і нямецкія манархісты. Тут ужо былі падрыхтованы контр-рэвалюцыйныя часткі з угорскіх і розных нанятых за вялікія грошы чужых белагвардзейцаў.

Карла й павёў іх з сабою на сталіцу Будапэшт. Аднака, угорскія войскі, верныя рэспубліцы, перамаглі. Карлу з яго жонкай Зітай злавілі і разам з некалькамі зрадзіўшымі рэспубліку міністрамі-панамі засадзілі ў няволю. Тымчасам, і Чэха-Славакія, занепакоеная,што манархічная авантура Карлы ўдасцца, абвесьціла частковую мабілізацыю сваіх салдат, каб ісьці ў Угоршчыну навадзіць парадкі. Цяпер усё сьціхлася, толькі палітыкі Антанты ламаюць галаву: куды, на які далёкі акіянскі востраў засадзіць неўгамоннага Карлу, каб ён ужо болей не лятаў на аэраплянах.

Другая навіна здарылася ў **Партугаліі**. Там рэвалюцыянэры скінулі стары ўрад, забілі некалькі старых міністраў і абвесьцілі новыя парадкі. Што гэта за парадкі, яшчэ невядома. „Gaz, Warsz.“ піша, быццам там—бальшавізм.

Справа **Верхняй Сьлезіі** яшчэ маець на сабе увагу цэлага сьвета. Палякі і немцы прынялі пастанову Лігі Народаў аб падзеле спрэчнай старонкі. Першыя як-бы здаволены, што выйшла хаця так, але дзень падзелу Верхняй Сьлезіі ня хочуць лічыць сваім нацыянальным сьвятам. Другія—навет абвесткі аб пастанове Лігі Народаў друкуюць у чорных жалобных рамках.

У **Нямеччыне**, дзеля няўдачы з Верхняй Сьлезіяй, зьмена міністраў. Апроч таго, шмат дзе забастоўкі эканамічнага і часам палітычнага характара.

у **Польшчы** цяпер уся ўвага на марцы. Новы міністр скарбу п. Міхальскі павёў надта цьвёрдую і сьмелую палітыку, каб направіць эканамічны стан гаспадарства. Урад хоча выбраць з абегу каля сотні міліярдаў польскіх марак спосабам вялікага падатку. Як гэта адаб'ецца на жыцьці Польшчы яшчэ трудна гаварыць, але марка ўжо, дзякуючы новай палітыцы, а таксама заграпічнай пазыцы і продажы скарбовых лясоў (Белавежская пушча) ўжо паднімаецца. Цэны ў Варшаве спалі, і некаторыя фірмы, меўшыя многа старых тавараў, збанкрутавалі. У зьвязку з думкай ураду падняць велічыню працоўнага дня над 8 гадзін, па ўсей Польшчы пракаціліся забастоўкі пратэсту.

Як паведамляе „Robotnik“, на месца Філіповіча польскім паслом у Маскву будзе назначаны Стэфанскі і сэкрэтаром пры ім Ладась.

Ірляндцы на канфэрэнцыі з Англіяй выступаюць войстра і заяўляюць, што зусім ня хочуць прызнаваць над собою абыякога верхавенства ангельцаў. На добры рэзультат канфэрэнцыі мала хто спадзяецца.

Францыя падпісала дагавор з туркамі-кемалістамі. Французы дастаюць Кілікію, дзе турэцкім урадам гарантуюцца правы меншасьці. Французы адтрымоўваюць права эксплёатацыі Багдадзкай дарогі.

Сэнат **Амер. Злуч. Штатаў**. ратыфікаваў міравыя дагаворы з Нямеччынай, Аўстрыяй і Угоршчынай.

Ува ўсі штатах энэргічна рыхтуюцца на выпадак паўстаньня забастоўкі. Ваеннае міністэрства загадала ўсім корпусным камандзерам трымаць напагатове вайсковых, знаёмых з чыгуначнаю справаю.

У справу чыгуначных работнікаў умяшаўся прэзыдэнт Гардынг. У Вашынгтоне спадзяюцца, што ўдасцца ўхіліцца ад забастоўкі, якая выклікаецца паніжэньнем платы.

У **Савецкай Расеі** новая эканамічная палітыка бальшавікоў разьвіваецца далей. Вольны гандаль расьцець. Многія фабрыкі аддадзены ўрадам пад арэнду.

Грэкі адступілі з усяго прастору, здабытага ў **турак** апошнім грэцкім наступленьнем.

Што будзе з Віленшчынай?

У № 57 „Nowin Wileńskich“ мы знаходзім вывед супрацоўніка газэты „Lietuva“ з прадстаўнікамі Літоўскай дэлегацыі на Жэнеўскай канфэрэнцыі п. п. Т. Нарушэвічам і Мілошам аб другім праекце п. Гіманса, добра ўжо усім нам ведамым.

Не ўдаваючыся ў разбор гэтага другога праекту Гіманса, прынятага і Радай Лігі Народаў і самой Лігай Народаў, мы павінны адзначыць, што Польшча адразу-ж ня згодзілася на гэты праект, а Ліга заняла досыць выразную пазыцыю, запрапанаваўшы к другому праекту Гіманса свае папраўкі і чакаючы прыняцьця іх Лігай Народаў.

Мы ня будзём уваходзіць тут у сутнасьць гэтых паправак, адзначыўшы усё-ж, што яны—гэныя папраўкі,—калі-б былі прыняты, надалі-б дзяржаўнаму ўстрою Літвы больш пэўны незалежны характар.

Ліга Народаў, як відаць з надрукованых у „Nowinach Wileńskich“ выведах з п. п. Нарушэвічам і Мілошам, яшчэ раз займецца справай Віленшчыны, бо падвойнае розгледжаньне Л. Н. Віленскай справы не дало яшчэ належных вынікаў.

П. п. Нарушэвіч і Мілош сьцьвярджаюць, што Ліга Народаў хоча аддаць Віленшчыну Ліцьве, а ня Польшчы, але пад варункам тэй ці іншай сувязі з Польшай.

Трудна, разумеецца, угадаць, якое вынесена будзе Лігай Народаў у палове сьнежня рашэньне. Але нам здаецца, што калі Ліга Народаў адмовіцца ад сваіх плянаў аб безварунковай сувязі Літвы з Польшчай, а так сама аб тым, што ў Ліцьве павінны быць дзьве дзяржаўныя мовы: літоўская, і польская (а куды-ж падзелася беларуская? Рэд.), то праект Гіманса мог-бы быць прыняты Літоўскай стараной, як падстава для дзяржаўнай канстытуцыі незалежнай Літвы.

Калі-ж Ліга Народаў ізноў вырашыць справу так, што Літва павінна зьявіцца афярай вялікадзяржаўнай польскай палітыкі, то вельмі трудна згадаць, як справа пойдзе далей. „Нам астаецца адна дарога: з Лігай Народаў“ — гатовы і мы сказаць разам з Літоўскай дэлегацыяй, праконана у карыстных для Літвы настроях Лігі Народаў. Маем надзею, што Ліга Народаў прыняўшы пад увагу інтарэсы ўсіх зацікаўленых, ізноў і аканчальна вырашыць справу Віленшчыны так,што мы ня будзем пакрыўджаны ў сваім родным краі.

М. К.

Што чуваць у сьвеце?

Балаховіч стане перад судом.

„Хвіля“ паведамляе з Варшавы, што польскі ўрад прымушан быў прызнаць пратэст ген. Балаховіча супроць яго выгнаньня з Польшчы, бо аказалась, што Балаховіч запраўды грамадзянін Польшчы. Аднак, каб не парушаць і ўмовы з Караханам, Балаховічу трэба станучь перад судом за ўсе злыя ўчынкі, зробленыя на польска-бальшавіцкім фронце.

Польшча і Савецкая Расея.

З варшаўскіх палітычных кругоў ведама, што бальшавікі ў Маскве пачалі ўжо плаціць Польшчы першую рату належнага ёй на аснове міравой умовы золата.

Яны мелі ўжо заплаціць польскаму пасольству тры міліёны рублёў, аднак, калі даведаліс, што выдаленыя з Польшчы маскоўцы астаюцца і далей у Варшаве, перарвалі выплату („Р. К.“).

Аўтаномія для Усходняй Галіцыі.

Як вядома, сьледам за справай Верхняй Сьлезіі і Віленшчыны, Ліга Народаў мае заняцца справаю Усходняй Галіцыі.

Каб падрыхтаваць памысны для Польшчы грунт у гэтай справе, польскія соцыялісты ўжо пачалі рабіць у гэтым кірунку.

Яны апрацавалі праект самаўпраўленьня для Усходняй Галіцыі, які выглядае болей-меней гэтак.

Аўтаномная тэрыторыя ахаплівала бы два ваяводзтвы з местам Львовам, усяго 42.533 квадратных кілёмэтраў пры 4.074.261 жыхары.

Жыхары Усходняй Галіцыі мелі-бы ўсе грамадзянскія правы і выбіралі-бы ў дзяржаўны сойм. Для патрэб аўтанамічнага законадаўства і для кантролю над аўтанамічнай адміністрацыяй быў-бы асобны краёвы сойм, зьбіраны што тры гады агульным галасаваньнем— роўным, тайным, беспасрэднім, прапарцыянальным і бяз розьніцы пола.

Да аўтанамічнага законадаўства наляжалі-бы справы мовы, веры (апроч спраў, якія датыкаліськ-бы заграпічнай палітыкі), школы і асьветы, справы мясцовай адміністрацыі, адміністратыўнага падзелу Усходняй Галіцыі, арганізацыі адміністратыўных і аўтанамічных уладаў, павятовых і грамадзкіх, справы паліцыі, справы земляробства (апроч аснаўной зямельнай рэформы) і інш.

Усходняя Галіцыя, як аўтаномная тэрыторыя, мела-бы ўласны буджет; краёвы скарб.

На чале аўтанамічнай адміністрацыі стаяў-бы прадстаўнік Польскай Рэспублікі і Краёвая Рада, абраная краёвым соймам прапарцыянальнымі выбарамі.

Правы польскай меншасьці ўва ўсіх галінах публічнага жыцьця былі-б загарантованы радам асобных пастаноў; ўрадовымі мовамі былі-б польская і ўкраінская аднакава.

Ніякі закон краёвага сойму не павінен ні ў чым парушаць канстытуцыі Польскай Рэспублікі.

Праект гэты будзе пададзен на разгляд у польскі сойм у недалёчкім часе.

Будучы сусьветны кангрэс эспэрантыстаў.

Міжнародная мова эспэранто усё болей пашыраецца ў розных старонках сьвета і мае вялікую будучыню. Магчыма, што яшчэ нашае пакаленьне дажывецца таго часу, калі мова эспэранто будзе прынята ўсімі культурнымі народамі, як найлягчэйшы спосаб згаварыцца самым шырокім масам розных нацыянальнасьцей усяго сьвета.

Апошні кангрэс эспэрантыстаў быў у гэтым годзе ў Празе. На ім было блізка 2500 дэлегатаў ад 42 народаў.

Будучы эспэранцкі кангрэс мае быць у Гэльсінфорсе. Фінляндзкі ўрад асыгнаваў на яго 250 тысяч марак.

„Łodzianin“ пішаць, што ў Фінляндыі можна таксама спадзявацца вялізнага ліку дэлегатаў, бо эспэранто там дужа пашырана, а ў Гэльсінфорсе выходзіць прыгожая ілюстраваная, багатая зьместам газэта „Esperanta Finlando“. Эспэранто заведзены ў Фінляндыі у многіх школах, сойм і мястовыя рады там заўсёды цікавяцца ідэяй эспэрантызму і памагаюць ёй спачуцьцём і грашыма.

Было-б дужа добра, каб і беларускія эспэрантысты ўжо паклапаціліся цясьней сарганізавацца і паслаць на будучы кангрэс беларуса-эспэрантыста.

Ультыматум Угоршчыне.

Баўгарская газэта „Палітыка“ паведамляе, што ўрады Малой Антанты паслалі угорскаму ўраду ультыматум з вымаганьнем выдачы Карлы, разбраеньня угорскай арміі і выплаты ім выдаткаў за мабілізацыю. Калі ультыматум ня будзе споўнен, чэскія і юга-слаўскія войскі пойдуць на Угоршчыну. (Пат).

Мабілізацыя ў Румыніі.

З Бухарэста паведамляюць, што ген. Аверэску мабілізуе пяхоту і коньніцу.

Немцы й палякі.

У Бэрліне былі варожая Польшчы дэманстрацыі. Пабіта дошка з польскім напісам на будынку польскага пасольства („Gaz. War.“).

Юга-Славія акупуе Албанію.

Юга-слаўскія войскі пасуваюцца ў глыбіню паўночнай Албаніі. (Пат.).

Баўгарыя.

Людзей, што забілі міністра Дзімітрава, правадыра правых, ня знойдзена. (Пат.).

Рэзалюцыя аб чыннасьці Балаховіча

«Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада ў Празе, абмеркаваўшы выступленьне Балаховіча пад нацыянальным беларускім штандарам, канстатуе, што:

1, Балаховіч ня мае ніякага падтрыманьня з боку беларускіх нацыянальных і палітычных арганізацый;

2, Зьвязаўшы сваё імя з беларускім адраджэнчым рухам, ён дагэтуль не ачысьціў сябе ад ганьбячых беларускае імя абвінавачаньняў у жыдоўскіх пагромах і грабежствах;

3, ён самавольна абвесьціў сябе Галоўна-камандуючым беларускіх вайсковых сіл і;

4, дазволіў сабе выдаваць акты дзяржаўнага змаганьня.

Дзеля гэтага Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада ў Празе пастанаўляе —

лічыць Балаховіча, да таго часу, покуль ён не апраўдае сябе перад беларускім грамадзянствам, — узурпатарам і авантурнікам».

Рэзалюцыя аб чыннасьці Свінкаава

«Прыймаючы пад увагу, што Савінкаў выступае за граніцай ад імені Беларусі і прыкрывае беларускім нацыянальным штандарам авантуры польскае і расейскае рэакцыі, арганізуючы на тэрыторыі Усходняе Беларусі жыдоўскія пагромы і правакацыйныя паўстаньні, а ў Заходняй Беларусі кіруючых абрусіцельнай і паланізатарскай працай, — Беларускае Нацыянальна—Палітычная Нарада ў Празе зазначае, што Савінкаў нямае ніякай сувязі з беларускімі палітычнымі і нацыянальнымі арганізацыямі і зьяўляецца правакатарам Беларускай Дзяржаўнасьці і ворагам беларускага народу».

Рэзалюцыя супроць жыдоўскіх пагромаў.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада ў Празе, азнаёміўшыся з тым, што за астатні час былі выпадкі жыдоўскіх пагромаў на Беларусі, вынесла рэзалюцыю, у якой між іншым сказана, што „на беларускай зямлі за ўвесь час многавяковага супольнага жыцьця беларусаў і жыдоў ня было ніводнага выпадку, каб мірнае жыцьцё 12-цёх міліённага беларускага народу з 3-ох міліённым народам жыдоўскім ацемрылася якім-кольвек крававым эксцэсам.“ Рэзалюцыя далей сьцьвярджае, што быўшыя за апошнія месяцы выпадкі зьвярынскіх распраў з жыдамі паходзілі ад розных бандаў, арганізаваных і прыведзеных на Беларусь людзьмі, нічога супольнага з беларускім народам нямаючых. Рэзалюцыя кажа: „Дзеля таго, што гэтыя агідныя факты робяцца на беларускай зямлі і могуць мець уплыў на дзе-якія несьвядомыя масы беларускага сялянства, уцягнуць і справацыраваць іх на тыя-ж крокі, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада рашуча пратэстуе процiў агітацыі цёмных сілаў на беларускай зямлі і зьвяртаецца да беларускага народа з перасьцярогай і просьбай ня прыймаць удзелу ў гэтай працы бандытаў і ўсімі сіламі змагацца з ёю“ Рэзалюцыя канчаецца так „... усю адпаведнасьць за эксцэсы, магучыя быць у будучыні ў межах акупаванай Беларусі, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада цалком ускладае на сумленьне сучасных акупантаў Беларусі.“

Украінскае жыцьце.

ПРАГА 25 кастр. (Е.Е.) У нядзелю урачыста адчынілі украінскі унівэрсытэт.

У справе ўшанаваньня 60-х угодак сьмерці Уладыслава Сыракомлі.

Адкрыты ліст.

У 1884 годзе варшаўская паліцыя забараніла Адаму Вісьліцкаму зьбіраць складкі ў „Przeglądzie Tygodniowym“ на памятнік Сыракомлі. У 1906 годзе скончыліся нічым стараньні рэдактара „Kurjera Litewskego“ дабыць у губэрнатара графа Татішчэва дазвол на ўвекавечаньне быцьця ў Вільні і сьмерці аднаго з найсардэчнейшых лірыкаў ня толькі нашага краю, ня толькі ў польскай літэратуры, але й на сусьветным Парнасе.

Так 10 год таму ў найменшай меры не магло быць яшчэ й гутаркі аб грамадзкім, тут у нас, ушанаваньні тварца „Dęboroga“, „Kęnsa Chleba“ і „Margera“ з прычыны 50-х угодак яго сьмерці, прыйшоўшай 15 верасьня 1862 году ў доме на той час Бабятынскага на вуліцы, якая цяпер завецца Каралеўскай.

Сяньня—стаяць перад намі адкрыта: усякі на тое пачынак і ўсякія спасабы для яго споўненьня.

Сьмела бяром пачынак у свае рукі, бо маем пеўнасьць, што трапляем у думку грамады Есьць у садзе, які завецца „Цялятнікам,“ у найзручным хараша выглядаючым месцу, тут-жа недалёчка ад

Каралеўскай вуліцы, цокаль, на якім стаяў бюст Пушкіна, вывезены з Вільні расейцамі ў 1915 г. Тварэц „Онегіна"—адзін з наймагутнейшых карыфэеў Паэзіі наагул, але што яму адумысьля да Вільні, з каторай яго ніколі нічога не вязала? На думку нашу, не зьняважым Пушкіна ў найлягчэйшай меры, стаўляючы на цокалі яго разбуранага памятніка—бюст Сыракомлі.

Зробіць яго мясцовы, наш, віленскі артыста. А мы, жыхары тэй зямлі лясных узгоркаў, зямлі зялёных лугоў, каторай ані на волас ня любім меней за вялікага паэта, які навет неба, узьнесенае над Барэйкоўшчынай, пачытаў за сваё, мы, паставіўшы той бюст пад Замковаю гарою, аддадзім яго Вільні. Хай праўнукі нашых дзяцей яшчэ схіляюць перад ім галавы і з гэтак прыгожых твораў Сыракомлі чэрпаюць вышу пачуцьцяў, шляхетнасьць спавіваючую глыбокае уміламаньне роднага краю. І калі скажуцць, хоць-бы калісь там, цераз гады. „Быў гэта першы прабліск супольнай, творчай грамадзянскай працы на супольнай ніве дабра і характва!.." у той час скажацца, што мы, скромныя прадстаўнікі чатырох аснаўных краёвых нацыянальнасьцяў, падымаем, вось, два заданьні: адно, спаўняючы акт піэтызму ва імя Культуры і Мастацтва, другое, пракладаючы шлях к новаму часу, стаячаму пад сьветлым знакам Адзінства і Згоды.

Памятнік зроблен будзе як ёсьць у працягу надхозячай зімы, а прыведзены ў парадак, адкрыты і аддадзены ў рукі месту будзе ў першай палавіне траўня будучага году.

Кошты прадвідзім, памяркоўна, невялікія. Конкурсу не абвяшчаем. Зварочуемся да грамадзянства—злажыць сумы да міліёна польскіх марак. Лісты складак „На памятнік Сыракомлі" адчыніць можа захочуць, не адкладаючы і аднaчасна, газэты і журналы: польскія, літоўскія, беларускія і жыдоўскія. Падробная справаздача абвешчана будзе ў віленскай прэсе ў траўні будучага году.

Чэслаў Янкоўскі.
Міхал Біржышка.
Якуб Гольдшмідт.
Антон Лявіцкі.

27.х—1921 г.

Унія Літоўска-Беларускага гаспадарства з Польшчай 1386-га году.

(З „Гісторыі Беларусі").

Пасьля сьмерці Альгэрда (1377) ў Літоўска-Беларускім гаспадарсьцьве пачынаецца смутак. Пасад Альгэрда займае старэйшы яго сын ад другой жонкі, Ульляны Цьверскай, Ягайла. Ягайлам нездаволены яго старшыя браты, сыны першай жонкі Альгэрда, Марыі Віцебскай, і зьвярнуліся да Масквы, гдзе ў гэты час быў вялікім князем Дзьмітры Данскі. Што датычыць да Кэйстута, малодшага брата Альгэрда, то ён, шануючы ідэю еднасьці гаспадарства і ня хочучы парушаць тэстамэнту памёршага брата Альгэрда, ня выходзіў з паслушэнства свайму пляменьніку Ягайле. Каб падтрымаць яго аўторытэт і даць другім князём прыклад паслухмянства вялікаму князю, ён у палажаны час езьдзіў да Ягайлы ў Вільню на пасяджэньне княжацкай рады, як езьдзіў і раней да свайго старэйшага брата Альгэрда. Аднак-жа гэтыя добрыя адносіны паміж Ягайлам і Кэйстутам хутка перарваліся. Ягайла надта баяўся аўторытэту і популярнасьці Кэйстута. Ен два разы зьвярнуўся да крыжакоў, каб з іх дапамогаю перамагчы і зрабіць безбаронным Кэйстута. Ня гледзячы на дапамогу крыжакоў, Ягайла быў разьбіты і пашоў на вераломную хітрасьць. Ен запрасіў Кэйстута з сынам яго Вітаўтам у свой абоз, быццам для таго, каб абгаварыць з імі ўмовы далейшых адносін. Як толькі яны зьявіліся туды, іх схапілі, закавалі ў ланцугі, завезьлі ў Крэва (Ашмянскі павет у Віленшчыне) і пасадзілі ў замчышчы ў турму. Сюды Ягайла падаслаў забойцаў, каторыя задушылі старога, слаўнага Кэйстута, а жонку яго Біруту ўтапілі. Вітаўту пашанцавала ўцячы з турмы ў жаноцкай вопратцы, каторую даставіла яму яго жонка Ганна. Такім спосабам, мы бачым, што Ягайла меў многа ворагаў сярод сваіх родных і стрэчных братоў, і яму трэба было шукаць апоры для свае ўлады дзесь за межамі гаспадарства.

У гэты самы час і ў Польшчы былі непаразуменьні ў справе дзяржаўнай улады. У 1382-м годзе памёр польскі кароль Людвік Вэнгерскі. Пасьля яго асталіся тры дачкі: Кацярына, Марыя і Ядвіга. Фамілія караля хацела пасадзіць на пасад сярэднюю дачку Марыю, каторая была жонкаю караля Вэнгерскага. Зьвязак Польшчы з Вэнгрыяй не падабаўся паном, дзякуючы таму, што нябожчык кароль, апіраючыся на Вэнгрыю, трымаў сябе даволі незалежна ад паноў. Два гады цягнулася бескаралеўе. Толькі ў 1384 годзе паміж фамілiяю караля і панамі зрабілася згода. Каралева паслала на польскі пасад малодшую дачку Ядвігу, 13-цёх гадоў. Было зразумела, што Ядвіга не магла сама кіраваць гаспадарствам, тым больш, што Польшчы, як і Ліцьве, цяжка прыходзілася ад крыжакоў. Трэба было знайсьці, такога чалавека для Ядвігі, каторы быў-бы ня столькі прыемным для яе, сколькі карысным для Польшчы. Ягайла, Літоўска-Беларускі гаспадар, здаваўся паном падхадзячым для гэтай мэты: перш за ўсё, Ліцьве пагражаў той самы вораг, што і Польшчы, апроч таго, хатнія спрэчкі ў Ліцьве за ўладу рабілі Ягайлу больш згаворным з польскімі панамі. Апроч палітычных думак, польскія паны трымаліся і сваіх клясавых інтарэсаў. Яны былі перакананы ў тым, што Ягайла, ў падзяку ім за сваё абраньне, пашырыць іх правы і прывілеі. Духавенства, так сама, спадзявалася, што шлюб Ядвігі з Ягайлам пашырыць і рэлігійна-палітычны ўплыў на Літву. І тыя і другія не абмыліліся.

Ягайла ў 1385-м годзе адтрымаў з Польшчы прапазыцыю аб шлюбе з Ядвігаю і злучэньні з Польшчаю. З якою ахвотаю ён адгукнуўся на гэтую прапазыцыю відаць з тых абавязкаў, якія налажыў ён на сябе і на сваё гаспадарства. На радах польскіх паслоў у Крэве ён абавязаўся прыняць каталіцкую веру са сваімі братамі, сваякамі, народам літоўскім знатным і простым, даваць грошы свайго гаспадарства на патрэбы Польшчы, дапамагчы Польшчы атрымаць паўднёвыя, аднятыя тэрыторыі, заплаціць адступнага 200.000 флёрынаў быўшаму жаніху Ядвігі, прынцу Вільгэльму Аўстрыйскаму і на вечны час прылучыць Літоўска-Беларускае гаспадарства да кароны Польскай. Польшча за ўсё гэта абяцала Ліцьве і Беларусі дапамогу ў барацьбе з крыжакамі.

На зьездзе ў Ваўкавыску былі ухвалены такія ўмовы злучэньня Польшчы з Літоўска-Беларускім гаспадарствам: кароль і вялікі князь у злучаных дзяржавах павінен быць адзін; у пачатку гэтая асоба ёсьць Ягайла, потым просты патомак яго і Ядвігі; надворныя зносіны ў справах, датычачых абедзьвух дзяржаваў, а таксама і абарона тэрыторыі робяцца супольна. Хатняе кіраваньне ў кожным гаспадарсьцьве асобнае: і ў Літоўска-Беларускай дзяржаве, і ў Польшчы маюцца—асобныя войскі, асобны скарб і асобныя ўрады. Апроч таго, як было ўжо сказана вышэй, Ягайла меў абавязак прыняць каталіцтва і шырыць яго паміж ліцьвіноў. Беларускаму насяленьню была пакінена свабода быць усходня-хрысьціянскай веры.

Так адбылася першая вунія Літоўска-Беларускай Дзяржавы з Польшчай. Вунія была зроблена больш на паперы, чым у жыцьці. Самавітасьць Літоўска-Беларускага гаспадарства пасьля 1386-га году фактычна ня была згублена. За прыкладам ісьці далёка ня трэба, даволі пазнаёміцца па якім-колечы падручніку з кіраваньнем Вітаўта, каторы быў асобным вялікім князем Літвы і Беларусі (1392—1430), ня гледзячы на умову вуніі. Кіраваў ён зусім незалежна ад Ягайлы, а потым (з 1431 году) ад Уладыслава III, каралёў польскіх. І толькі інтрыгі збоку Польшчы не далі яму магчымасьці каранавацца і зрабіцца Літоўска-Беларускім каралём. Нямецкі імпэратар паслаў карону Вітаўту, але гэтая карона да яго не дайшла. Летапіс так апісвае гэтую падзею: „І ляхове, ня жычыўшы кароны Літве, карону ад іх (паслоў імпэратара) тую адабраўшы і разсекшы яе наполы, пріложылі ко короне біскупа краковскага, каторая і цяпер пры замку касьцёле сьв. Станіслава ёсьць".

І ў далейшыя часы мы бачым, што Літва і Беларусь маюць часта сваіх асобных вялікіх князёў, што ідзе напроць умоў вуніі 1386-га году. Ніжэпаданая табліца дасьць патрэбныя для нас прыклады:

ЛІТВА І БЕЛАРУСЬ	ПОЛЬШЧА
Вітаўт 1392—1430 Сьвідрыгайла 1430-1432	Ягайла-Уладыслаў II 1386—1434
Жыгімонт I 1432—1440	Уладыслаў III 1434-1444
Казімер I у Ліцьве і Беларусі 1440—1492, да 1447 асобны ад Польшчы Літ.-Бел. гаспадар.	Казімер IV у Польшчы 1447—1492
Аляксандар 1492—1506 да 1501 асобны ад Польшчы гаспадар.	Ян-Альбрэхт 1492-1501 Аляксандар 1501-1506
Жыгімонт II (у Ліцьве і Белар.) Стары 1505-1548	Жігімонт I (у Польшчы) Стары 1506 1548
Жыгімонт III (у Ліцьве і Белар.) Август 1548-1572	Жыгімонт II (у Польшчы) Аўгуст 1548-1572

Як мы бачым з гэтай табліцы, толькі з цягам часу Літва і Беларусь страчаваюць сваіх асобных гаспадароў. Гэта паказвае, што вунія 1386-га году толькі адкрыла шырэй дарогу для польскага ўплыву. Затым трэба адзначыць, што тыя асобы, якія былі літоўска-беларускімі гаспадарамі і польскімі каралямі, ў першыя часы пасьля вуніі лічылі сябе больш літоўска-беларускімі гаспадарамі, чым польскімі каралямі. Гэты факт зразумелы, калі прыняць пад увагу становішча караля ў Польшчы, гдзе шляхта ўжо пачала забіраць караля ў свае рукі. Літоўска-Беларускі настрой такіх польскіх каралёў магчыма бачыць, напрыклад, у такім юрыдычным дакумэнце, як „Земскіе привилеи" Казімера I (у Польшчы IV). Толькі пад канец пэрыяду, калі, пад польскім уплывам і пад уплывамі другіх прычын, умовы жыцьця зьмяніліся, агульныя дзяржаўцы Літвы, Беларусі і Польшчы пачалі інтарэсы Польшчы ставіць вышэй інтарэсаў Літвы і Беларусі. Такім гаспадаром быў, напрыклад, Жыгімонт III (у Польшчы II) Аўгуст, апошні з дому Ягайлавага.

Што жыцьцё дзяржавы Літоўска-Беларускай пасьля 1386-го году ў асновах сваіх не змянілася фактычна, відаць яшчэ і з таго, што акты вуніі паміж дзьвюма дзяржавамі ўсё пішуцца і пішуцца. Паўтарэньне актаў гаворыць аб тым, што ня маюць моцы ў жыцьці. Калі-б акт 1386-га году быў моцным рэальна, то ня прышлося-б пытаньне аб вуніі падымаць на зьездах больш, чым дзесяць разоў. Мы ведаем, што гэтае пытаньне падымалася ў сьледуючыя гады: 1401, 1413, 1447, 1451, 1453, 1501, 1563, 1564, 1566, і 1567. Як мы бачым з пераліку гадоў, пытаньне аб вуніі асабліва падкрэсьліваецца ў 60-я гады 16-га сталецьця. Насьпелі якіясь прычыны, каторыя патрабуюць пэўнай, рэальнай вуніі. Глаўнейшай з гэтых прычын быў той польскі ўплыў, якому была адчынена брама ў Літву і Беларусь актам 1386-га году. Апроч таго, на вунію з Польшчай гоніць Літву і Беларусь націск з усходу, з Масквы. Гэты націск робіцца асабліва моцным якраз у 60-я гады 16-га сталецьця. Ратуючыся ад тэрору Івана Грознага, наша бацькаўшчына падпісала, ўрэшце, апошнюю сваю вунію з Польшчай у горадзе Любліне ў 1569 годзе. Гэтая вунія скончыла незалежнае, самавітае істанваньне Літоўска-Беларускага гаспадарства.

У. Ігнатоўскі.

Народы Беларусі.

(З „Роднага Краю").

На зямлі беларускай жывець народу нямала — міліёнаў 16 усіх будзе. Беларусоў будзе міліёнаў 12. Апрача беларусоў, жывуць тут ліцьвіны, жыды, ёсьць крыху палякоў, стараверaў-маскоўцаў, немцаў, латышоў, татараў.

Ня ўсе беларусы ведаюць, хто яны такія. Нашым краем даўгі час валадалі палякі цы маскоўцы, дык яны ўсё стараліся перарабіць нас на свой капыл: палякі на палякоў, а маскоўцы на—маскоўцаў. Гэта-ткі ім удалося. Нашы тутэйшыя паны, шляхта, а часам і мяшчане па большай часьці завуць сябе палякамі; а яны папраўдзе беларусы. Затое ўсіх чыноўнікаў ды іншых беларусаў, што паканчалі маскоўскія (расейскія) школы ды прывыклі гаварыць памаскоўску, маскоўцы перацягнулі на свой бок; яны таксама не прызнаюцца да свайго беларускага роду і называюць сябе рускімі і чураюцца свае роднае мовы. Папраўдзе маскоўцаў, або велікарусаў навет у гарадох вельмі мала; на вёсцы сустракаюцца часам маскоўцы — велікарусы-стараверы. Іх шмат ёсьць каля Гомеля і Дзьвінска.

Яны ўжо некалькі сот гадоў, як уцяклі да нас са свайго краю, бо іх там надта ціснулі за іхнюю веру. У местах, часам і ў дварох, можна сустрэць і праўдзівых палякоў. Яны пераехалі калісь з Польшчы на службу да нашых вялікіх князёў. Вялікія князі параздавалі некаторым з іх вялізныя прасторы зямлі, і цяпер яны лічаць, што гэта зямля польская. Але зямелька нашая, як была, так і асталася беларускай, бо на польскага пана працаваў беларускі селянін-гаротнік.

Жыды перайшлі ў Беларусь з Нямеччыны да Польшчы. Яны ўзялі ў свае рукі ўвесь гандаль і рамяство ў гарадох і мястэчках. На вёсках іх мала, бо там, апроч беларусаў, блізка ніхто ня жыве. Але якой-бы веры ня быў беларус, ён усё роўна астаецца беларусам, бо ён ім радзіўся.

Немцы таксама бываюць дзьвюх вераў: лютэранскай і каталіцкай. Але і тыя і гэтыя ўсё-роўна немцы, толькі тая розьніца, што адзін ходзіць у кірху, а другі ў касьцёл. Ніколі сябе каталік

ДЭКЛЯМАТАР*).

Янка Купала.

КУРГАН.

Памяці С. Палуяна.

I.

Паміж пустак, балот Беларускай зямлі,
На ўзьбярэжжы ракі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі,
Удзірванелы курган векавечны.
Дуб гальлё распусьціў каранясты над ім,
Сухазельле у грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханьнем глухім,—
Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.
На Купальле там птушка садзіцца, пяе,
У Паліпаўку воўк нема вые;
Сонца днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатыя.
Хмары неба ўсьцілалі мо' тысячу раз,
Пяруны білі з края да края,—
Ен стаіць—гэта памяць людзкая—паказ...
Толькі гутарка ходзе такая.

II.

На гарэ на крутой на абвітай ракой,
Лет назад таму сотня ці болей,
Белы хорам стаяў, недаступнай сьцяной
Грозна, думна глядзеў на прывольле.
У нагах у яго расьцілаўся абшар
Хвоек гонкіх і пахані чорнай,
Сонных вёсак шары, хат амшалых, як мар,
Хат з сям'ёй душ падданых, пакорных.
Князь у хораме жыў, слаўны сьвету ўсяму,
Недаступны і грозны, як хорам;
Хто хацеў, не хацеў—біў паклоны яму;
Спуску, ласкі ня знаў непакорам.
Зьняважаў, катаваў ён з дружынай сваей;
Стражы князевы ў полі і дома;
Толькі модлы расьлі небу ў сэрцах людзей,
І праклцьце расло пакрысёма.

III.

Раз бяседа вялікая ў князя была:
На пасад дачку-княжну садзілі,
За сталом він заморскіх крыніца цякла,
Бегла музыка ўкруг на паўмілі.
На вясельле-разгул наплыло, як на сход,
Госьці знатных з усюль, за паўсьвета;
Гэткай гучнай бяседы ня помніў народ,
Гэткіх скарбаў, брыянтаў, саетаў!
Дзень-другі ўжо грымела у князя гульня,
І музыкі, і чаркі зьвінелі;
Выдумлялі забаў новых кожнага дня;
Што хацелі, ўсяго госьці мелі.
Ажно трэцяга дня князь прыдумаў адну
Для дружыны пацеху, забаву:
Загадаў ён пазваць гусьляра-старыну,
Гусьляра з яго ведамай славай.

IV.

Акалічны народ гусьлі знаў гусьляра;
Песьня-дума за сэрца хапала;
Вакруг гэтай душы дудара-званара
Казак дзіўных злажылась нямала.
Кажуць, толькі як выйдзе і ўдара як ён
Па струнах з неадступнаю песьняй,—
Сон зьлятае з павек, болю цішыцца стон,
Ня шумяць ясакоры, чарэсьні:
Пушча-лес ня шуміць, белка, лось не бяжыць,
Салавей-птушка ў той час сьціхае;
Паміж вольхаў рака, як што дзень, ня бурліць,
Паплаўкі рыба-плотка хавае.
Прытаіцца да моху русаяка, лясун;
Каня вечнага «піць» не заводзе;
Пад звон-песьню жывучых гусьляравых струн
Для ўсіх папараць кветка ўзыходзе.

V.

Прывяла гусьляра з яго ніўных сяліб
Дворня князева ў хорам багаты;
Пасадзілі на ганку, між клёнаў і ліп,
На пагляным парозе магната.
Нявыдумная сьвітка—убор на плячах,
Барада, як сьнег белы — такая,
Нязвычайны агонь у задумных вачах,
На каленях ляглі гусьлі-баі.
Водзе пальцам худым па сталёвых струнах,
К песьні-музыцы ладзіцца, строе;
Водклік б'ецца ад струн па сьцюдзёных сьцянах,
Заміраючы ў сховах пакояў.
Вось настроіў, навёў тон у струнах, як сьлед,
Ня зірнуўшы на гулі ні разу,
І сядзіць гэты сумны, як лунь, белы дзед,
І чакае ад князя прыказу.

VI.

„Што-ж маўчыш ты, гусьляр, ніў, лясоў песьня-бай,
„Славай хат маіх подданых слаўны?!
„Нам сягоньня зайграй, нам сваіх песень дай.
„Князь умее плаціць нязвычайна!
„Запяеш па-душы, дасі ўцехі гасьцям —
„Поўны гусьлі насыплю дукатаў;
„Не пад-мысьль песьня будзе каму-небудзь нам —
„Канапляную возьмеш заплату.
„Знаеш славу маю, знаеш сілу маю...
„Многа знаю і чуў аб табе я,—
„І я сам, як і ты, так табе запяю...
„Ну, пара пачынаць, дабрадзею!"
Гэтак слухае, выслухаў князя гусьляр;
Заіскрыліся вочы сівыя;
Патануў у скляпеньнях адзін, другі ўдар,
І заплакалі струны жывыя.

VII.

„Гэй, ты, князь! гэй, праслаўны на цэлы бел-сьвет!
„Не такую задумаў ты думу,—
„Не дае гусьлярам сказу золата цьвет,
„Белых хорамаў п'яныя шумы.
„Скурганіў-бы душу чырванцом тваім я;
„Гусьлям, княжа, ня пішуць законаў:
„Небу справу здае сэрца-думка мая,
„Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.
„Відзіш, княжа, загоны, лясы, сенажаць,—
„Ім пакорны я толькі з гусьлямі.
„Сілен, грозен і ты, і твой хорам-астрог—
„Б'е ад сьцен, цэгел лёдам зімовым,—
„Сэрца маеш, як гэты цагляны парог,
„І душу—як скляпоў гэтых сховы.

VIII.

„Глянь ты, слаўны ўладар, на палеткі свае:
„Сарачні там сох бачыш, як блудзе,
„А ці чуў ты, аб чым там араты пяе?
„Дзе і як жывуць гэтыя людзі?
„Глянь у лёхі свае, ў падзямельлі глянь, князь,
„Што настроіў пад хорамам гэтым:
„Брацьця корчаппа там, табой кінуты ў гразь,
„Чэрві точуць жывых іх, разьдзетых.
„Ты ўсё золатам хочаш прыцьміць, загаціць...
„Ці-ж прыгледзіўся, хорамны княжа?
„Кроў на золаце гэтым людзкая блішчыць,
„Кроў, якой і твая моц ня зможа.
„Ты брылянтамі ўсыпаў атласы і шоўк—
„Гэта цёртая сталь ад кайданаў,
„Гэта вісельні петляў разьвіты шнурок,
„Гэта, княжа, твае саматканы.

IV.

„Стол ты ўставіў ядой, косьці шмат пад сталом,—
„Гэта косьці бядноты рабочай.
„Пацяшаешся белым, чырвоным віном,—
„Гэта сьлёзы нядолі сірочай.
„Хорам выстраіў ты, твайму воку так міл,
„Адшліфована цэгла і камень,—
„Гэта памяткі-пліты з няўчасных магіл,
„Гэта сэрц скамянеўшыхся пламень.
„Люба чуці табе зкочны музыкі звон:
„Ты, дружына п'іцё асалоду,
„А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стон,
„Стон праклцьця табе, твайму роду?!
„Ты зьбялеў, ты дрыжыш, слаўны княжа, ўладар!
„Госьці хмурны, а дворня зьнямела...
„Ну, што, княжа? пара даць за песьню мне дар!
„Выбачай, калі сьпеў мо' няўмела."

X.

Князь стаіць, князь маўчыць; жуда, помста б'е з воч
Гулі зглухлі: ні жартаў, ні сьмехаў...
Думаў князь, выдумляў, дрогнуў шабляй наўзбоч,
Толькі з лоскатам выбегла рэха.
„Гэй, ты, сонцу раўня, не на тое пазваў
„На вясельле цябе сваей княжны!..
„Ты—шалёны, стары! хто цябе дзе хаваў?
„Ты, знаць, вырадак цемры сярмяжнай.
„Ты адважыўся мне на сьляпы перакор
Вызваняці сусьветныя трэлі;
„Платы маю шмат я для такіх непакор,
„Хто сябе проці мне стаць асьмеліў.
„Я пакнязеўску ўсім і плачу, і люблю;
„Ты ня хочаш дукатаў,—ня трэба!...
„Узяць старца і гусьлі жыўцом у зямлю!
„Знае хай, хто тут пан: я, ці неба!"

XI.

Падхапілі, ўзялі гусьляра-старыка,
Гусьлі разам яго сама-гуды;
Па-над бераг круты, дзе шумела рака,
Павялі, панясьлі на загубу.
Месца выбралі здатнае, вырылі дол,
Дол тры сажні шырокі, глыбокі;
Закапалі, убілі асінавы кол,
Далі насып тры сажні высокі.
Не часалі дамоўкі яму сталяры,
Не заплакалі бліжнія вочы;
Змоўклі гусьлі, і ён з тэй пары—да пары;
Сум і сьціша залеглі, як ночай.
Толькі князеўскі хорам гудзеў, не маўчаў;
Шалы, музыка ў тахт рагаталі;
Не адну віна бочку князь кончыў, пачаў:
Шлюб-вясельле ўсё княжны гулялі.

XII.

Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
На гусьляравым наспе жвіровым

*) Гл. № 7.

немец не называе паляком, або французам, бо немцы сьвядомы народ.


Трэба, каб і ўсе беларусы былі сьвядомымі беларусамі.

А. Смоліч.

З Літэратурнай Хрыстаматыі.

Вінцук Дунін-Марцінкевіч (1807 –1884)

Сярод пісьменьнікаў нашай новай літэратуры самае выдатнае месца займае Вінцук Дунін-Марцінкевіч. Ен быў родам з Бабруйскага павету Менскай губэрні, дзе яго бацка рандаваў фальваркі. Скончыўшы гімназію ў Бабруйску, Марцінкевіч вучыўся на доктара ў Пецярбурзе, але доктарам ня быў, а ўсё сваё жыцьцё праслужыў у розных установах Менску.



Б. Дунін - Марцінкевіч

Напісаў ён болей за ўсіх нашых пісьменьнікаў 19-га сталецьця. Пісаў Марцінкевіч повесьці, апавяданьні, лірычныя вершы і камэдыі; пісаў толькі вершам. Найлепшым творам Марцінкевіча лічыцца повесьць „Гапон“ (1855 г.), з камэдый вялікім усьпехам карыстаюцца „Залёты“ і „Пінская шляхта“. У сваіх творах Марцінкевіч паказываў з добрага боку і паноў і мужыкоў, а ўсю віну за дрэннае жыцьцё селяніна ускладаў на аканомаў, войтаў і іншых панскіх слуг. Панскасьць яго дахадзіла да таго, што ён нічога ня пісаў навет супроць прыгона. Дзеля гэтага і з іншых прычын творы Марцінкевіча з ідэйнага боку не стаяць высока ў нашай літэратуры. Перад скасаваньнем паншчыны ў пісьменьніка зрабіўся нейкі пералом, і ён напісаў верш „Вясна, голад, перапала“.. (1860 г.), які зусім не падобны па думках да яго ранейшых твораў. Ня гледзячы на паказаныя заганы ў творчасьці Марцінкевіча, значаньне яго ў гісторыі нашай літэратуры і культурнага разьвіцьця наагул—вельмі паважнае.

Вясна, голад перапала...

(Напіс. ў 1860 г.).

Вясна, голад, перапала,
Ані солі, ані круп,
І скаціне корму мала,
І самому ані ў зуб.
На палацях дохнуць дзеці,
Жонка тры дні здуру п‘ець,
І даўно парожна ў клеці,
І парожная асець.
Каліта ляжыць пад лаўкай,
А пры ёй парожны гляк,—
Ад каляд мы з кумам саўкай
Пацяралі ў губе смак.
Але гора ўжо спаўгора;
Цыц, нябога, трошкі цыц!
Вось нам вольнасьць дадуць скора,
І, як птушкі, будзем жыць.
К чорту, жонка, ласа баба!
Бяры чорт і каліту,
А папусьці вожкі слаба
І дай волю хамуту.
Будзем роўныя з панамі,
Самі будзем, як паны,
І гарэлку піць жбанамі
І гуляць так, як яны.
Перастануць нашым братам,
Як скацінай таргаваць,
Напускацца ліхім матам,
Скуру з ног да карка драць.
Хоць галодна, хоць халодна,
Холад, голад ні пачом!
Вот каб толькі нам свабодна,
На свабодзе аджывём.
Вось панам ня дужа лоўка,
Самім трэба працаваць
Пабаліць ня раз галоўка,
Калі прыдзецца араць.
Не адзін то напацеець,
І заскачыць драпака,
Бо сам толькі есьць умеець!
Ды драць скуру з мужыка,
Як-бы быў якой скацінай,
Або горшы ад яго:
Білі пугай ды дубінай,
А цяпер, брат—ого, го!
Мужык будзе не скацінай.
Ня раз скажыць пан з паноў:
„Пане Грышка, пане Міна!
Як-жа, васпан, ці здароў?“

В. Дунін-Марцінкевіч.

Якой нацыянальнасьці „беларускі“ генарал (?) Булак-Балаховіч?

Як ведама з газэт, ня так даўно паміж прадстаўніком Савецкай Расеі ў Варшаве п. Караханам і віцэ-міністрам заграніччых сцраў Польшчы п. Домбскім адбылася ўмова, на моцы якой некульні расейцаў, украінцаў, а з імі і „генарал“ Булак-Балаховіч павінны пакінуць Польшчу, яны займаліся анты-савецкай працай. П. Балаховіч, не здавольнены такім рашэньнем, напісаў пратэстуючы ліст у Варшаўскі Сойм, а так сама і віцэ-міністру п. Домбскаму. У гэтым апошнім п. Балаховіч, паміж іншым, гаворыць, што ён—

—ёсьць поўнапраўным абывателем Польскай Дзяржавы;

што „ў вайне за Польшчу я (г. ё. п. Балаховіч) мой брат і чатыры цёгчыных маіх братоў: 2-х Карловічаў і 2-х Урублевічаў пралівалі кроў.“

Вельмі дзякуем п. Балаховічу за шчырасьць, за праўду, каторую ён у канцы канцоў раскрыў перад намі ўсімі. Бо сярод нас былі такія, а мо й цяпер яшчэ ёсьць, што верылі у беларускасьць п. Балаховіча і ў тое, што ён сурраўды ваяваў і змагаўся за незалежную Беларусь, як ён гэта абвяшчаў пад час свайго наступленьня на бальшавікоў у напрамку Мазыр-Рэчыца-Гомель, будучы ў кампаніі з „тэж бялорусінэм“ п. Аляксюком.

Перад намі ляжаць адозвы „бацькі Балаховіча“, заклікаўшага у свой час усіх беларусаў станавіцца пад штандар незалежнай Беларусі, якую ён гатоў быў вызваляць ад усякай (?) чужацкай няволі, але ў першую чаргу абвяшчаўшага скінутымі ўсе беларускія урады, якія гдзе-небудзь ёсьць, - паміж іншым урад Ластоўскага, забываючы што беларускі урад знаходзіпца за граніцай на палажэньні эмігранта і што над Беларусьсю пануюць не беларускія урады.

На месца „скінутых“ урадаў п. Балаховіч паставіў урад п. Адамовіча і Аляксюка, фактычна-ж апошняга, бо п. Адамовіч быў толькі шырмай.

І вось—незалежнік п. Аляксюк, які стаіць цяпер „на грунце польскай дзяржаўнасьці,“ і п. Балаховіч, які называе сябе цяпер „поўнапраўным абывателем Польскай дзяржавы,“ ваяваўшым за Польшчу,“—якой яны нацыянальнасьці?

Мы ніяк ня можам уцяміць, як гэта можна абвяшчаць паход іісьці вайною за незалежную Беларусь і потым „стаяць на грунце польскай дзяржаўнасьці,“ „ваяваць за Польшчу“ і г. д.

На наш пагляд: адно з двух... або за незалежную Беларусь, або за Польшчу.

Пятлюра, напрыклад, не заяўляў яшчэ, каб ён ваяваў за Польшчу, а не за Украіну, хоць ён і ваяваў разам з палякамі процiў балшавікоў.

Так вось, паночкі, пытаньне: якой нацыянальнасьці п. п. Балаховічы і да іх падобныя?

Вельмі цікава!

Ук...

Гдзе есьць беларускасьць або нашы маленькія жаданьні.

У № 241 віленскай „Жэчыпосполітай“ пан Я. О., разглядаючы артыкул з № 7 „Бел. Ведам.“ аб сьлескай справе, хоча упеўніць сваіх прастакоў-чытаньнікаў, што мы памыляемся, прызнаючы віленскіх беларусаў за беларусаў... Пан Я. О., без аніякіх гістарычных фактаў і наўпрэкі навет найпаважнейшым польскім гісторыкам, цьвердзіць, што мы не беларусы, а мазуры, ці лепей кажучы—зьбеларушчаныя мазуры.

На сваіх гістарычных адкрыцьцях пан Я. О., аднак, моцна не стаіць і ахвотней згаджаецца браць пад увагу толькі сучаснае становішча.

Пахваліўшыся, што ён добра знае віленскія месты й вёскі, пан Я. О. кажа, што ён толькі нядаўна спатыкаецца з беларушчынай і толькі ў мястах. Далей, замест таго, каб проста і шчыра адрачыся ад сваей выдумкі аб коштах, на якія выдаюцца „Беларускія Ведамасьці“, пан Я. О. піша, што „беларуская прэса ня вырасла з масы беларускага люду“, што яна да вайны істнавала на няведамыя грошы, у часе вайны аплачывалась нямецкімі грашмі, а цяпер жывіцца ад польскага ўраду або з іншых крыніц, пагражаючых навет палітычным крыміналам!

Пан Я. О. ня ведае, што беларуская прэса створана сваёй народнай інтэлігенцыяй, тымі дзяцьмі „масаў беларускага люду“, з якіх некаторыя, ува ймя ідэі, навет у магілу пайшлі без пары,—цераз меру працавалі і не даядалі кавалка хлеба, каб толькі была гэтак нялюбая пану Я. О. прэса.

Пан Я. О. ня хоча ведаць, што „Наша Ніва“ выдавалась на грошы падпісчыкаў, якіх мела у дзесяткі і соткі разоў болей, чым мае цяпер віленская „Жэчпосполіта“, а таксама й на дабравольныя складкі, на ахвяры і на грошы, вырučаныя нябожчыкам Іванам Луцкевічам ад продажы польскім паном розных старых іх фамільных брыльдзюлек, ня вельмі патрэбных Беларускаму Нацыянальнаму Музэю.

Пан Я. О., кажучы, што быццам адна беларуская газэта выдавалась за нямецкія грошы, забываецца з такім-жа аснаваньнем сказаць, што польскіх газэт немцы выдавалі некалькі. І беларускі, як і польскі, народ, і гонар гэтых народаў—пры чым тут? Што датыча рэдактарства, то важна не фамілія Зузэміля, Пільца, Шульца, Обста ці якая-сь іншая, а важан кірунак газэты: ці яна прадажная ці не. Урэшце—далікатнасьць за далікатнасьць: ці ведае п. Я. О., што ў аднэй варшаўскай эндэцкай, як і „Жэчпосполіта“, газэце, з яе ведама, працуе цяпер чалавек, каторы быў раней... рэдактарам бальшавіцкага органу! Ці ня ведае таксама ён, на якія даляры выдаюцца і некаторыя эндэцкія газэты?

Шкода, апроч таго, што п. Я. О. не называе той газэты на беларускай мове, якая запраўды выглядае так, як-бы яе „рэдактарам і выключным кіраўнікам ёсьць польскі падахвіцэр“.

Далей п. Я. О. кажа, што ў вядомых для яго вёсках Віленшчыны ня знаюць навет слова „Беларусь“, „беларускі“. І мы помнім, што да вайны шмат-дзе гэтага ня ведалі, а пры стане асьветы ў Сярэдняй Літве падобная цямнота магчыма і цяпер. Есьць навет таія вучыцялі і асабліва вучыцелькі, быўшыя раней у вайсковых мундзірах, якія мяшаюць у вадно нацыянальную і рэлігійную прыналежнасьць, думаюць, „што каталік, то і паляк“ і ня вераць, што рымскі папеж не паляк і ня ўмее папольску.

Яшчэ далей п. Я. О., гаворачы толькі ці аб запраўдных паляках ці аб зусім спольшчаных беларусах і ліцьвінах, рознай мэтафізыкай узноў і ўзноў прыводзіць у большую пеўнасьць самаго сябе, што нашы сяляне, усёжтакі мабыць—мазуры.

Бог з ім, хай сабе шукае на здароўе, „gdzie jest polskość“ (так называецца яго артыкул), а мы на заканчэньне скажам, што ў Віленшчыне ёсьць ня толькі польскасьць, але ёсьць і такая беларускасьць, якой навет шукаць ня трэба. Яна ёсьць ня толькі скрозь па вёсках, але ў рыначныя дні цягнецца да Вільні амаль ні па ўсіх трактах, а зазвычай хаваецца ў Вільні ў дворніцкіх каморах, па розных майстэрнях і ўсюды, найбольш пры самай цяжкой працы. Магчыма, што навет у рэдакцыі „Жэчыпосполітай“ кур‘ерам—беларус.

Есьць, апроч каталіцкай Беларусі, яшчэ і праваслаўная віленская Беларусь, аб якой п. Я. О. зусім маўчыць.

А вось і нашыя маленькія (непалітычныя!) жаданьні: дайце нам магчымасьць вольнага разьвіцьця нашае культуры, не гаварыце, п. Я. О., нялепак аб тым, што мы не дарасьлі да правамець сваю нацыянальную школу, не рабіце нам наогул усяго таго, чаго разам з намі не жадалі польскаму народу пад маскоўскім панаваньнем,— і тады ўжо будучыня пакажа, гдзе ёсьць польскасьць і гдзе ёсьць беларускасьць. А нам чужога ня трэба і свайго не аддадзім!

А. Мсьціслаўскі.

Палыны узышлі, вырас дуб малады,
Зашумеў непанятлівым словам.
Лет за сотню зьвёў час, ці і болей мо‘ лет;
Зацьвілі пераказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гусьлямі дзед
С кургана, як сьнег, белы выходзе.
Гусьлі строз свае, струны звонка зьвіняць,
Жменяй водзе па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
І на месяц глядзіць, як сам, белы.
Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той,
Не зазнаў бы ніколі ўжо гора...
Можна тут веру даць—толькі слухаць душой...
Курганы шмат чаго нам гавораць.

Аляксандар Пшчолка.

„У ціятры“.

Сяджу я, браткі, у тым самым ціятры, аж зараз адзін у скрыпку — пісь, другі падняў трубу — прагудзеў, трэці павешаў рагавень — зарухаў. Кожны наладзіў для парадку свой штрумэнт. Слухаю я: нязграбна, трубяць, ды ня тым трахтам. Скуголяць, аж ня лоўка слухаць. Той жа, што сядзіць пасярэдкі, мецію, мецію, ды як махане́ць пугаўём, а тыя, што з бакоў, кожны з свайго штрумэнта як сьцебануць, як раўкнуць, як сыпнуць! Во, браткі, каго паслухаць!.. Ого-го! Гэта ня жарты!.. Панасавы цынбалы? — Цьфу! Нічога ты, Хвядос, нярты пасьля таго!.. І Пятрусёва скрыпка і блізка не падходзіць! Крый, Божа! Калі-б усе цынблы сабраць, і самаго Язэпа, і Маркаву дуду, і Зьмітраковых мальцаў у рад паставіць, і Сідару пугаўё ў рукі — і то ні блізка! Барані, Бо-о-ог! Таму — ні трубы, ні басэтлі, ні паўдзежкі... Якія трубы? Што дым ідзець — Цьфу! Ату табе, Мікіта, ату, балота! Што ты відзіў? Нічога ты ня відзіў! Ты відзіў толькі балота, вёску ды сьвіньней!.. Труба гэта бліскуча, як самавар, з найлепшага масяндзовага матарыялу. Адна равець, другая храпіць. Ву-ву-ву! — во як.

Ізноў-жа дудкі, наўродзе жалеек, тыя больш вярха, ціль-ціль-ціль, гдзе пісьніць, гдзе сьвісьніць! Басэтля-ж здорава гудзіць, ды і работы з ёю даволі. Жарты — ён чэшыць смыкам, аж лоб трэць. Здаровая махіна, досыць працы! Ну і так з драбязы у скрыпку драбняку падсыпаюць даволі, валяць у вадну руку і ўсе па кніжках глядзяць. А той пугаўём ведай махаіць і туды, і сюды, проста пад нос бліжэйшым падступаіць. Жарылі, жарылі, тады сталі, а жалейкі і скрыпкі давай самі па сабе розныя штукі вывадзіць. Ваводзяць, скуголяць. І труба да іх патроху прыстала. Я-ж думаю, вось табе й раз! Зьбіліс на быкі... Аж зараз той самы пугаўём як махнуў к таму, што на канцы сядзіць, а той размахнуўся булдавешкай ды як дасьць па паўдзежку, а паўдзежык — лоп, лоп, лоп!.. Аж проста ў пяткі коліць. Пад канец-жа, як разыйшліся, як сыпнулі барджэй барджэй, ён пугаўём жарыў, жарыў і — бац! Сталі ўсе і стаяць..

Паны ці былі? Ды так што ўсе паны. З нашых, з мужыкоў, ня відаць. І я дастукаўся затое, што Сымонавы капоты апрануў і ў Трахіма ботаў дастаў. Ня ўсякага і пусьцяць. Дзе я сядзеў? Уверсе. А ўнізе — паны, на зямлі, знацца, на сьценах паны. Як—на сьценах! А так, калі, прыкладам прыбіць да сьценак кошыкі і ў кошыкі наторкаць розных паноў, а ў сьцяне зрабіць вокны, а в вокнах дзьверы, а цераз дзьверы ход. Дык вось ты, прыкладам, сядзіш у кошыку, а захацеў вон, адчыніў — і валі, куды хочаш... Табе сьмех, балота ты!.. Толькі ўнізе паны найбольш з мужчын, сьпераду з лысых болі, тады з вайсковых, з вурадніках, з прыставоў, а на сьценах паны з панятамі і з жонкамі. Але увабраны ўсе воўк іх еж, — лоўка. Праўда, танкаваты троху з бакоў, але нічога. Усё болі у чырвоным-а рукі голы, як вось, калі, дзяжу месяць бабы, і так каля шыі не зашпілена, на галаве валасы памялом, а самі фуфырацца, сьмяюцца, вачамі во гэтак, а тыя, адзаду што стаяць, — у іхнае вуха нешта шэпчуць, Там-жа на кошыку скрыначкі ат табакі: з тых скрыначак пані патроху бяруць і памалу каштуюць у прыкуску.

Тады што было? Тады, як сыгралі троху, кожны пайшоў адпачнуць, і я драбануў. Усё болей каля боку дзяржу і ўсё віджу. Паны лупяць у харчэўню і зараз за гарэлку. Праўда, сьцябаюць лоўка. Толькі ня так, як у нас: у нас болей проста з горла ды ў горла. А там кілішкі, як жураваль, і закуска, і рыжы чалавек каля іх бегаіць. Я, гэта, выняў цыбук, хацеў пакурыць... Аж нейкі курносы кажаць мне: „А ты што?“ — „Я, кажу, з гарладзёркі“. А ён мне кажаць: „Падальшы, падальшы!“ Я тады каля сьцяны, ды ў дзьверы, ды ня ў тыя. Заблудзіўся. Во, каб цябе! Праўда, рыжы падышоў, паглядзеў на мае дакументы, ды мяне за руку, ды за плячо, ды на лесьвіцу: „Калі, кажаць, ты з гарладзёркі, дык і сядзі на гарладзёрцы“. — „Я, кажу, заблудзіўся троху“. — „Ідзі, кажаць, пакуль, па шыі не палучыў“. Але, ўсёткі, відаць, з благародных: і гаворыць ласкава, і ня штурхаіць. Я вышэй, вышэй, бокам і трапіў на свой трахт, ды ня свае дываны.

Гляджу на бакі, уверх, уніз. Аж разам той самы пугаўём—шарах! А тыя хто ў трубы, хто ў скрыпкі... Тады, браткі, і сьцяна паднялася. Дадушы-ж паднялася! Сьцяна такая намалёваная, з конямі. Гляджу я. Божухна Ты мой! Выскачыла многа ўсякага люду, але не ад тутэйшых паноў, і давай пляць. Расьпінаюцца, крычаць, гойкаюць, бегаюць, скачуць усё во гэтак подскокам. Тады к ім выскачыў нехта белы, у балахоне. Бегаіць, скуголіць і рукой во гэтак паказавае. Ізноў якая-то баба ці-то маладзіца да іх падскочыла. Пішчыць, плачыць, аж за сэрца хапаіць. І Бог ведаіць, якое што тут зачыналася, аж уваччу замітусілася. Нічога не гавораць, а плачуць, гойкаюць, за горла хапаюць, рукі уверх падымаюць. Во так болей: го-го, го-го, гі-гі-і! Зайцоў зганяюць? Не-е! Гэта не балота! Я сам сьпярша думаў, што, знацца, гоняць каго, аж не-е. Яны так межа сабой. Пакрычаць, пойдуць адзін к аднаму, абнімуцца, цалуюцца і ўзноў разойдуцца. Тады белы, што ў балахоне — падыйшоў к таму, што з пугаўём, і пачаў крычаць, крычыць адзін, аж голас трасецца, і руку к яму цягне, пугу, мусіць, хоча схапіць, а той, ведай сваю справу—жарыць, а той тонкі каля басетлі працуець. Гляджу я: сьцяна валіцца, валіцца,—і закрыла таго, што ў белым. А паны давай крычаць, б‘юць у далоні, дзяруць горла, аж вочы вон. Найболей з гарладзёркі, нагамі навет стукаюць. І тыя, што ў кошыках, плёскалі, але патроху... Усякі на ўсю сілу крычыць: брысь, брысь, брысь! а другога нічога не разабраў. Крычалі, покуль белы цераз дзірку галаву не прасунуў. Прасунуўся і кланяецца. Во гэтак. Ён-жа пайшоў к сабе, а яны ізноў крычаць; так крычаць асабліва з гарладзёркі, што аж вочы на лоб. У, мяне аж у вушох затрышчэла. Думаю сабе: пайду прачухаюся на холадзе. І пайшоў, каля сьценкі збачыўшыся, ды на лесьвіцу, ды па лесьвіцы, ды к дзьверам, ды к другім (тут я ізноў лысых увідзіў: мусіць к гарэлцы пайшлі), ды к трэцім, ды за дзьверы. Гляджу, аж Сымон і Трахім мяне чакаюць, піпкі паляць. —„Хадзі, кажуць, дамоў, бо Мэндаль запрэць кватэру. Заўтра, кажуць, рана трэба на машыну“.—„Во, каб вы выхварылі! Яшчэ, кажу, прыстаўленьне будзець!“ А яны: „Мае боты, мае капоты, трэба на машыну“...

А што рабіць? Я не мае, знацца, боты, ды не мае капоты, ды й ад куманства не аставацца, дык я й драбануў з імі на кватэру, а тады і дамоў.

Дык вось якая справа, а ня тое, што Панасавы цынбалы... Цьфу!

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Народная перапіс.

На захоняй часьці Беларусі, на так званых папольску „Kresach wschodnich“ адбылася народная перапіс.

Рабілі гэтую перапіс на вёсках, амаль ня ўсюды, польскія вучыцялі, валасныя пісары й іх памочнікі. Беларускаму вучыцелю рэдка-дзе давялося прымаць удзел у перапісі. Так у Валожынскім павеце, Лугамавіцкай воласьці, ёсьць 11 вучыцялёў польскіх школ, з каторых адзін беларус, і вось 10 з іх атрымалі званьне перапішчыкаў, а беларусу адмовілі.

Гэтыя, так званыя кваліфікаваныя, перапішчыкі выхрышчывалі беларусаў на палякоў рознымі спосабамі. Досіць цікавы спосаб выхрышчываньня быў ужыты ў вёсцы Дзягілі Жосьнянскай воласьці, дзе перапішчыкам быў памочнік валаснога пісара пан Чыж. Вось ён і засьпяваў, але не па чыжынаму: „Калі хто будзе запісывацца, што ён беларус, то выцанім у Менск на пяскі, дык лепей для вас саміх запісацца палякамі.“ Пасьля такое прамовы п. Чыж ні ў воднага селяніна не запытаў, якое ён нацыі, як быццам-бы у яго такое графы ня было, а проста ўсіх, і праваслаўных каталікоў, запісаў „narodowości polskej“. Трэба заувражыць, што ў вёсцы Дзягілі каталікоў вельмі мала.

Праўду кажучы, гэтаму паночку няпершыня змагацца з беларускасьцю. Ён лез із скуры вон, каб не дапусьціць адчыніць беларускую школу ў Слабадзе. Стагнаў бедны дзень і ноч, пакуль паставіў на сваім. Але жаднае карысьці для сябе не дабыў, а толькі вёска засталася бяз школы.

Вельмі цікава ведаць, колькі яшчэ засталося беларусаў на крэсах і калі гэтых, што засталіся, пад камандаю пана Чыжа пагоняць у Менск на пяскі?

Я. Відук.

М. Докшыцы Дунілавіцкага павету.

У лістападзе 1919 году, дзякуючы п. Ш., быў сарганізованы „Гурток Моладзі“, і ў Докшыцах адбылося першае беларускае тэатральнае прадстаўленьне. Ставілі: „Па рэвізіі“—Крапіўніцкага і „Антось Лата“ — Міцкевіча. П‘еса „Па рэвізіі“ надта добра была згуляна. П‘еса-ж „Антось Лата“ была горш згуляна, дзеля таго што артысты нядобра ўцямілі свае ролі і навет некаторыя, як п. П., сваей ігрой маглі зачапіць рэлігійнае пачуцьці жыдоў, каторых многа было ў тэатры.

Але пасьля гэтага выступленьня наступіў даўгі перарыў, і толькі ў восені 1920 году аднавілася праца Гуртка, каторы выступае сыстэматычна, стаўляючы як старыя, так і новыя белабускія сцэнічныя творы. У працягу 6 месяцаў было пастаўлена каля 8 сьпектакляў на карысьць бедных беларусаў і на літэратуру. Ставілі: „Модны шляхцюк“ „Міхалка“, „Па рэвізіі“, „Як яны жа-

16

яліся",Паўлінка",,,Сватаньне",,,Мядзьведзь" і інш. Але знахадзіліся людзі, каторыя з нас строілі зьдзек, нас крыўдзілі, уважалі за нішто, хацелі нас зусім ня бачыць і нарэшце цывільная ўлада забараніла сьпектаклі на беларускай мове, к таму-ж, у нашым гуртку ня было унугранай спайкі. пашоў раздор паміж сабой... і гурток перастаў існаваць.

Прайшло пасьля таго чатыры месяцы. Думка стварыць беларускі тэатр ізноў паявілася ў тутэйшых беларусаў. Сталі ізноў гуртавацца, на чале чаго стаў Старшыня Пажарнай Грамады п. Шашко-Хвашчыніскі Карп, на ініцыятыве каторага ўжо 16 кастрычніка быў пастаўлен беларускі сьпектакль.

Было прадстаўлена: „Страхі жыцьця"—Аляхновіча і „Мядзьведзь"—Чэхава. П'есы былі згуляны здавольваюча. Хаця пасьля дзесяцідневага вышкаленьня трэба было з пеўнасьцю чакаць, што спектакль пройдзе трохі лэпей. Але ня ўсе артысты добра ўцямілі значаньне гэтага спектаклю ў такім месьце, як Докшыцы, і не належна аднясьліся к сваёй рабоце, а навет перад самым сьпектаклям рабілі няпрыемнасьці кіраўніку вечара і тым толькі абніжалі сябе ў вачах нашых ворагаў і шкодзілі слаба-налажанай тутэйшай беларускай працы.

Але як-бы сьпектакль сам па сабе ні прайшоў, а трэба прынясьці шчырую падзяку кіраўніку п. Шашко-Хвашчынскаму Карпу за яго вялікую працу, бо паміма таго, што была добрая мэта сьпектакля, дана была яшчэ магчымасьць нашай публіцы убачыць сваё роднае на сцэне, каторага ня бачылі добрых чатыры месяцы.

19.х.21 г. К.

М. Гальшаны Ашмянскага павету.

Летась у гэтай воласьці было шэсьць беларускіх пачатковых школ: у м. Гальшаны, ў в.в Валовікі, Карабы, Міхалоўшчына, Пашкішкі і Навасяды. Вучылі ў гэтых школах: вучыцелька Юрьвюк, вучыцель Гулька, вуч. Раманцэвічанка, вучыцялі Данілевіч, Юрэвіч і Дубнік.

Валасная Рада ў нас ня выказавае волі свайго насяленьня; пастанавіла ўсюды ў воласьці адчыніць польскія школы і ніводнае беларускае.

Гаспадары м. Гальшан і вёсак Корабы, Валовік, Міхалоўшчыны не згадзіліся з пастановаю валасной рады і пачлі самі дабівацца беларускіх школ. Яны падалі заявы школьнаму інспэктару ў Ашмяне і ў Беларускі Школьны Аддзел пры Дэпарт. Асьветы ў Вільні і прасілі пакінуць і на сёлетні 1921-22 школьны год у іх беларускія школы. Крыўда для беларускіх школ была такая відавочная, што інспэктар Ашмянскага пав. зацьвердзіў і на сёлетні год беларускія школы у гэных чатырох пунктах, і ужо там былі занятк. Але Дырэктар Дэпарт. Асьветы паперай за № 2054 загадаў школьным інспэктарам зачыніць усе тыя урадовыя беларускія школы, аб якіх не пастанавіла валасная рада. Загад гэты Дырэктара Дэпарт. Асьветы споўнены ўжо інспэктарам Ашмянскага павету.

У Гальшанскай воласьці 4 беларускія урадовыя школы зачынены, а вучыцялі звольнены. Тое самае зроблена з 2-ма беларускімі школамі ў Крэўскай воласьці ў вёсках Арляняты і Бацяняты, дзе вучаць вучыцелка Марыя Станкевічанка і вучыцель Стрыга. Насяленьне страшна абурана гэткімі несправядлівымі пастановамі і дабіваецца прызнаньня яго правоў на беларускую школу. Людзі пеўны, што гэтакі несправядлівы загад Дырэктара Дэпартамента Асьветы будзе адменены.

Гальшанец.

Шутавічы Ашмянскага павету.

Даўно думалася: вазьму алавок, ды чыркну аб нашым войце, але ўсё неяк адкладаў; думаў, што ён паправіцца. Ен служыць таму, хто мае сілу. Яго чалавекам назваць добрым або разумным няможна, бо, калі былі у нас бальшавікі, дык ён прад усім называў сябе беларусам, думаючы, што беларусаў бальшавікі надта любяць, а як прышлі палякі, дык узноў стаўся паляком. Словам, хітрыць наш „ясьневельможны і вялікі пан" войт. Але ці на доўга—ня ведаем. Аб патрэбах людзкіх ён ня думае, бо ня ўмее думаць. Ен толькі аб сабе думае, дык на што ён нам патрэбны? Трэба нам пастарацца сабе другога войта, даўно ўжо гэта трэба.

Карналінец.

М. Ільля Вялейскага павету.

23 кастрычніка г. г. на агульным сабраньні пайшчыкаў кааператыва „Ластаўка" у м. Ільлі, Вялейск. павету, падаўляючай большасьцю галасоў беларусы выказалі веру членам праўленьня і дзякавалі яму за добрую працу. Некалькі сяброў-палякоў і несьвядомых беларусаў-каталікоў на чале з тутэйшым панам К., каб сарваць сабраньне пакінулі яго і пашлі дамоў. Яны хацелі перавыбараў. На гэтым сабраньні былі—начальнік Ільскага раёну і прадстаўнік міліцыі. Ад Віленскага Саюзу Кааператываў быў Інструктар п. Гармановіч.

На гэтым сабраньні сябры пастанавілі купіць на 200.000 мар. сечкарэзак, каторыя будуць давацца пайшчыкам на пракат.

Чыстага зыску Ільскі кааператыў па 1. X. 21 г. маець звыш 600.000 мар.; усяго капіталу больш міліёна.

Сябра.

В. Дуброва Сталпецкага павету.

Наступіла ўжо пара вучыцца, а школы, на якую чакаюць беларусы, няма і невядома, ці будзе. Будынкі ёсць у нас два. У вадным адчынілі польскую школу, але далёка ня ўсе згадзіліся пасылаць туды сваіх дзяцей. Есьць тут і беларуская настаўніца, катораяя сядзіць бяз працы, дзеля таго што школу адчыніць не пазваляюць. Ксёндз тутэйшы навет выразна сказаў: „Барджэй расейская школа, як беларуская". Апроч ксяндза, ёсць у нас і поп, і абодва яны ня любяць усё беларускае, але дзіўна, што і адзін аднаго ня любяць. Поп дык навет кажа так: „Я сам тутэйшы (Навагрудзкага павету) і добра ведаю, што праўдзівай беларускай мовы няма, — што вёска, то і мова, — і вучыцца яе няма чаго".

Вось дык „тутэйшы"!

Есьць у нас касьцёл, каторы у расейскія часы быў пераробле на царкву, а цяпер ізноў перарабілі на касьцёл. Адзін жыхар(каваль) згодзіўся за 300 марак узьлезьці і спілаваць „схізматыцкія" (так называе ксёндз праваслаўных) пераклaдзінкі на крыжу. Есьць і царква на могілках, толькі дужа малюсенькая, але і тую наравяць адабраць каталікі.

Далось мне чуць тут такую гісторыю. Адзін жыхар, па прозьвішчу П. Б . . . . а, ня маючы, мусіць, дроў, паехаў у ксяндзоўскі лес і насек там гальля. Даведаўся аб гэтым ксёндз. У нядзелю, як усе сабраліся да мшы, ксёндз, убачыўшы „злодзея", зьвярнуўся да ўсіх, кажучы: „Вон яго з касьцёла, тут яму ня месца!" Але ніхто і не зварухнуўся на гэга прыказаньне. Тады ксёндз сказаў: „Калі яго ня выганіце, дык ня буду адпраўляць імшы." Невядома, чым-бы ўсё гэта скончылася, каб не знашоўся прахадзячы жаўнер, каторы ўзяўся яго вытурыць Але ня тут тое было, „грэшны" і ня думаў выхадзіць! Знашоўся яшчэ нейкі памоцнік, і ня гледзячы на тое, што „грэшны" ўсеўся на падлозе, не хацеўшы выхадзіць, яго за рукі і за ногі выцягнулі на двор. Так і не ўдалося яму адмаліць свае грахі.

Акурат цяпер дачка гэтага „грэшнага" мае выхадзіць замуж за „схызматыка" каторы дастаў у папа дазвол вянчацца ў касьцёле. Але ксендз дык і гаварыць не захацеў, а за то, што яна ідзе за „схызматыка", прад усім народам у касьцёле сказаў, што заўседы будзе яе праклінаць, і ня толькі ён, але і біскуп, і папеж сьвенты.

Гэта ўжо другі выпадак. Першы раз, як маладыя ехалі ў царкву, дык ксёндз сказаў званару, каб ён званіў, як па нябожчыку.

У вапошнюю нядзелю арганізавалі тут беларускі сьпектакль. Паставілі апэрэтку. Народу было біткам набіта, навет і стары пастух ахвяраваў 200 марак (бо білеты былі ад 50 да 200 марак) і цэлую гадзіну стаяў, дзівуючыся з радасьцю і цікаўнасьцю.

І такое ўсіх пачуцьцё ўзяло, што навет польская вучыцелька, каторая не далюбліваe беларусаў, прадэклямавала „Ад веку мы спалі".

Гралі на сцэне пераважна каталікі.

Падарожны.

Голас сіраты з прытулка.

Рэдактар, брат наш родны!
Мо ёсьць куток свабодны —
Сіроткі пашкадуйце
Мой вершык надрукуйце!

Цяжка, цяжка сіраціне
Між чужых людзёў
Горка, горка мне дзяціне,
Без сваіх бацькоў.

Матка родная памерла
Татку цар забіў
Цётка жыцьце мае сьцёрла
Брат мяне забыў;
Я хацела-б на магілку
Матанькі схадзіць,
Выліць горкую сьлязіну
Краску арасіць.

Я жадала-бы ад таткі
Лісьцік атрымаць
Што прыехаў ён да хаткі
Брата пакараць.

Толькі гэтага ня будзе,
Бо няшчасна я
Хай сіротка не забудзе,
Што нявольная.

Той садочак і дварочак
Зельлем зарасьлі
Дзе гуляла, паглядала
Рожы як цьвілі.

Гэтта мушу я бясконца,
Вельмі гараваць,
Можа ўбачу калі сонца,
Трэба пачакаць.

Прытулковая В.

ХРОНІКА.

— Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прысланўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

плачывалі яшчэ запамогі. Усё гэта выдумка п. Я.О.

— Віленскія польскія газэты шмат пішуць аб тым, што неўзабаве будуць выбары ў Сойм Сярэдняе Літвы. Мы, аднак, затрудняемся яшчэ сказаць што-небудзь пеўнае ў гэтай справе.

— Старажы віленскай Катэдры злавілі двух зладзеяў, якія меліся абакрасьці гэты касьцёл. Зладзеі па дакумэнтах аказаліся — адзін студэнтам, другі паручнікам; абодва прыехалі ў Вільню са Львова.

— Вярнуўся ў Вільню з падарожы па Заходняй Эўропе беларускі дзеяч Б. Тарашкевіч.

— Выйшла новая кніга на польскай мове — „Krótki zarys historji literatury białoruskiej" М. Гарэцкага (пераклад з беларускай мовы).

— Уступілі запраўднымі сябрамі ў „Т ва Беларускае школы": 117. Міхал Галяс, 118. Пётра Навагонскі, 119. Пётра Пятровіч, 120. Правук Кіркоўскі, 121. Адольф Осьцік (усе — гаспадары з Ашмянскага павету).

— 25 кастрычніка былі перавыбары Прэзыдыума Рады Т-ва Белар. Школы. Старшынёю застаўся А. Смоліч. Сэкрэтаром выбраны І. Краскоўскі.

— Навагрудзкае ваяводзтва легалізуе статут Віленскага Саюза Кааператываў пад варункам, што ў Навагрудку будзе адчынена кантора Саюзу і вызначаны Сябра Управы. Такім прадстаўніком прапануецца Уладыслаў Сталыгва

— У Вязынскай воласьці на пабор 1899 і 1900 гадоў некруты явіліся ня ўсе. Хто не явіўся, таго забіралі разам з бацькам (В.).

— У Даўгінаўскім раёне шмат падохла скаціны ад пошасьці чумы.

— З Даўгінава ўцёк вучыцель. Школа стаіць парожняя; няма каму вучыць дзяцей.

— З Даўгінава паведамляюць, што ў в. Пагосты Аўсея Марголіна, які хадзіў басанож, укусіла за нагу нейкая муха. Доктар Хург ня мог даць рады. Хворага павязьлі ў Вялейку, дзе ён зараз кончыўся.

— У Даўгінава прыехаў пан Аскерка і заказаў капаць яму на пляцы, гдзе калісь была канцэлярыя пристава. Адкапалі вялізарную бочку з гарэлкай, закопаную прыставам Бураком у 1914 г.

— Амерыканскія даўгінаўцы, пачуўшы аб тым-сім, што парабілася ў м. Даўгінаве за ўвесь час вайны, зложыліся і паслалі дэлегата у Даўгінава М. Левіна. Ен прывёз шмат даляраў і раздаваў усім жыхаром мясьцечка. Даўгінаўцы праз нашу газэту шчыра дзякуюць М. Левіну за яго стараньні і справядлівасьць і асабліва за тое, што ён болей як трыццаць гадоў прабыў у Амерыцы й не забыўся на сваіх землякоў. Грошы М. Левін раздаваў ня толькі жыдом, а й беларусам. Даў і на рэмонт царквы. Цяпер мясьцечка трошкі апраўілась, ажыло; людзі сталі будавацца, бо вялікая бяда была з тым, што ня было дзе жыць.

Вульф Сосенскі.

— Я. Нялепка (Піліпаў), быўшы супрацоўнік „Jednaści", піша ў „Беларускім Звоне" аб „бессэнсоўнасьці і наіўнасьці" „Беларускіх Ведамасьцей". Справа ў тым, што п. Нялепка з нашым супрацоўнікам гутаркі аб замучаўшым п. Нялепку сумленькі (за супрацоўніцтва ў „Jednaści" супроць пераконаньняў)... „ня меў", але казаў тое неаднакраць у яго прысутнасьці разам з прысутнасьцю некалькіх асоб!

— Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарадзе ў Празе была прыслана прывітальная телеграма, між іншым, ад гуртка жыдоўскіх студэнтаў з Беларусі, с ухаючых унівэрсытэцкі курс у Празе.

— У Вільні невядомыя людзі аграбілі абшарніка Лідзкага павету пана Кабылінскага на 15 міліёнаў марак. Нядаўна Кабылінскі прадаў адзін свой двор і частку леса, аб чым экспропрыятары, пеўна, ведалі.

— „Віл. Утро" паведамляе, што Часовая Урадуючая Камісія Сярэдняе Літвы прыняла прапазыцыю Дырэктара Дэпартамэнта Асьветы, каб у мешаных польска-беларускіх школах выкладалася расейская мова.

У другім нумары той-жа газэты, пад вельмі няўдачным загалоўкам „Белоруссы протестуют против русскаго языка", зьмешчана такая заметка:

„У зьвязку з пастановай Час. Урад. Камісіі, каб у беларускіх школах абавязкова выкладалася расейская мова, п. П. Аляксюк, ад імя Беларускага Хаўрусу, які ён прадстаўляе, падаў ген. Жэлігоўскаму, Старшыні Час. Ур. Кам. ген. Макржэцкаму і Дырэктару Дэпартамэнта Асьветы вострыя пратэст, дамагаючыся скасаваньня гэтае пастановы. Дырэктар Д-та Асьветы абяцаў п. Аляксюку падаць яго пратэст на разгляд Урад. Камісіі у бліжэйшае паседжаньне".

Па гэтых заметках справа выглядае няясна. На шкоду, і нам яшчэ невядома сутнасьць новага праекту Дырэктара Дэпартамэнту Асьветы п. Ліхтаровіча. Для карысці той-жа справы лічым патрэбным адзначыць вось што. Арганізаванае беларускае грамадзянства ніколі не пратэставала ні супроць расейскай, ні супродь польскай мовы, бо абедзьве яны патрэбны для культурнага разьвіцьця беларусаў, але ў пеўных варунках жыцьця і ў пеўных школах. Беларусы пратэставалі і будуць пратэставаць там, дзе гэтыя мовы заводзяцца, каб змагчы беларушчыну. На шкоду, мешаныя пачатковыя польска-беларускія школы, быўшыя ўжо на практыцы, завадзілісь не для карысці навучаньня і ня дзеля таго, каб запраўды здабыць у насяленьня сымпатыі да падобных школ, а дзеля таго, каб выкладаючы ўсе навукі папольску і расейскую мову, як прадмет, гэтым самым выціснуць зусім беларушчыну і барджэй аканчальна спольшчыць школу сярод беларускага люду. Паланізатарам страшна не расейская мова, як чужая беларусам і якую лёгка посьле выкінуць, а страшна мова беларуская. Урэшце трэба адзначыць, што п. Аляксюк зьяўляецца прадстаўніком беларуска-польскагага „Зьвёнзку Краёвэго", і хоць мы, падходзячы другой дарогай, згаджаемся з яго пратэстам, аднак, моцна дзівуемся, чаму п. Ліхтаровіч у справе беларускай школы так уважна слухае п. Аляксюка. калі яму выпадае з большай уважнасьцю і ня посьле пастановы, а перад ёю прыслухівацца к голасу сьпецыяльнай беларускай грамадзкай установы — Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады і к голасу... ну хоцьбы свайго ж урадоўца дзеля беларускіх школ п. Тарашкевіча, каторы, мы пеўны, таксама ніколі ня згодзіцца з тым, што цяпер дзеецца ў адносінах да беларускай школы. А п. Аляксюк, каб яго новыя лаўры не выглядалі таннымі посьле ўсяго таго, што ўжо пісалася ў беларускай прэсе аб школах, добра зрабіў бы, запратэставаўшы супроць усяе несправядлівасьці школьнай палітыкі ў Сярэдняй Літве у вадносінах да беларусаў.

— Прысланыя з Амерыкі грам. Бубешка пяць даляраў перададзены рэдакцыяй „Беларускіх Ведамасьцей" „Таварыству Беларускай Школы".

— Куды—куды толькі ні закінула Усясьветная Вайна беларусаў.

Апыніліся яны і ў Марока.

Сумныя лісты і весткі атрымліваем мы зтуль ад іх.

„Служым ў інастранным легіону.

Як папалі сюды, дык і самі добра ня ведаем...

Адны ехалі морам з Сыбіры на Бацькаўшчыну, другія ірваліся з Арханьгельску.

Чамусь-ці, апыніліся, бяз хлеба і грашэй, на набережнай ў Канстантынопалю.

Галадавалі..

Потым падпісывалі якія-сь паперы і кантракты.

Цяперака, на камнёх і пясках, днём паміраючы ад жары, а ў ночы дрыжучы ад холаду,— ходзім па Марока і заваёвываем гэтую старонку пад Францыю.

Ня ўсё Марока яшчэ паднала пад Францускую руку.

Яшчэ трэба нам „узяць" і „пакарыць" самую цяжкую частку—горы Малаго і Вялікаго Атласу.

Праціўна нам гэтая паганая праца.

Але падпісаны кантракты, і ні з кім не цэрамоніцца вайсковая француская дысцыпліна.

Даруй нам, Бажуна, і зьлітуйся над намі!

Гэту катаргу змушаны мы царпець яшчэ тры гады.

Прасьці нас і ты, Беларускі Народзе!

Не для карысьці і не з ўласнай думкі і волі апыніліся мы тутака і кожны дзень і кожны час праклінаем той мамэнт, калі рука нашая падпісала невядомую паперу.

Усім братам нашым шлем шчыры і гарачы прывет."

— Цікавыя людзі ковенскія праваслаўныя айцы духоўныя. У Ковеншчыне, асабліва ў Коўні, сабралася ўся маскоўская буржуазія, аджа нядаўна сам былы обэр.-пракурор Сіноду быў на зьезде превaслаўных. Беларусаў праваслаўных ёсьць даволі, але на чале „Беларускай Грамады," у якую большасьцю уваходзяць праваслаўныя, стаяць паны, якія мала супольнага маюць з нашым народам, хоць усе яны, бязумоўна „тоже бѣлоруссы." Маскоўская перавышка даходзіць да таго, што у беларускім батальёне, дзе толькі ахвіцэры праваслаўныя (болей маскоўцы), а жаўнеры амаль што ня ўсе каталікі-беларусы ці ліцьвіны, альбо жыды, прымушаюць гэтых неправаслаўных жаўнераў пяяць „Ойча Наш" па-славянску; дзеля дзесятку ахвіцэраў маецца сьвяшчэньнік, дзеля тысячы жаўнераў, на жаль, няма ксяндза-беларуса.

Нядаўна тутэйшы праваслаўны дзекан Ковенскі а. Эўстафі Каліскі (родам беларус) выдаў цікавы „Русско-Літовскій православный календарь" У яго памятных днёх ёсьць даты скананьня ўсіх маскоўскіх цэсараў, вядомага К. П. Пабеданосцава і г. д., здарэньні з жыцьця Літвы і Беларусі ўзяты самыя „радасныя"—прылучэньне уніятаў, прылучэньне Беларусі, прылучэньне Эстоніі, Латвіі і Фінляндзіі (ўсё да Маскоўшчыны, зразумела). Календар пачынаецца словамі: „Хай будзе воля твая! прасіце і дана будзе вам."

Усе роўна, ойча, цара не вярнуць!

У справачным аддзеле указана, што у маскоўскай школцы на могілках у Коўні са 106 вучняў палова беларусаў. Улетку падымалася пытаньне аб тым, каб абеларусіць гэтую школу, ды відаць Міністэрства і Грамада Беларускія мала працавалі у гэтым кірунку.

Зялёнагорскі.

АПОШНІЯ НАВІНЫ

— „Prsz. Wiecz." паведамляе, што ген. Г Радзішэўскаму ўдалося зрабіць у капіталістаў Францыі і Бэльгіі пазыку для Польшчы 500 міліёнаў франкаў па курсу 96 па 6 прац.

— „Gaz. Kr." паведамляе, што дэкрэт ген. Жэлігоўскага аб скліканьні Сойма ў Вільні зьявіцца ў сьпецыяльным нумары „Dz. Urzed.", мабыць, у сераду на тым тыдні. Выбары будуць назначаны на 11 сьнежня (дзекабра). Адзін дэпутат прыдзецца на кожных 7.000 жыхароў.

Паштовая скрынка.

О. Ярэмчэнко. Кнігі можна выпісаць з Беларускай Кнігарні (Wilno, Zawalna. 7), выслаўшы грашавую належнасьць. Маскоўска-беларускі слоўнік каштуе ў Вільні 75 польскіх марак, „Вянок" Багдановіча 75, „Гісторыя Беларусі" Ігнатоўскага 150. Кнігарня можа выслаць каталёг.

Шчыра Вам дзякуем за прысланае.

К. Е.—Рыга. Рэзалюцыі Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады ў Празе друкуем ня ўсе і ня поўнасьцю па незалежных ад нас прычынах.

За прысланае Вамі шчыра дзякуем.

В. Лукашэвічу - Рубяжэвічы—Радзім Вам выпісаць каталёг кніг Беларускай Кнігарні ў Вільні (Завальная 7). Патрэбнае Вам знойдзеце ў „Зборніку сцэнічных твораў"—І і ІІ часць, а таксама ў розных іншых выданьнях.

Ш.—Несьвіж. Будзьце ласкавы пісаць толькі з аднаго боку ліста паперы і по магчымасьці—чытальней.

Курс на грошы ў Вільні.

29 кастрычніка 1921 г.	мар.
Нямецкія маркі (1000)	26
Франкі франц.	290
Даляры	3975
Золата рублі (10)	17500

Рэдактар і Выдавец Максім Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК", Субач 2.